яны фактычна спынілі работу. Пасля вызвалення дзейнасць сав. органаў адноўлена. У адпаведнасці з дапаўненнямі да Канстытуцыі ССРБ 1919, прынятымі 2-м з'ездам Саветаў Беларусі, у снеж. 1920 створаны СНК і 13 рэсп. Н.к.: замежных спраў, па ваен. справах, унутр. спраў, юстыцыі, працы, асветы, сац. забеспячэння, фінансаў, земляробства, нар. сувязі, аховы здароўя, харчавання, рабоча-сял. інспекцыі (РСІ). Правы Н.к. мелі Савет нар. гаспадаркі [з 1924 *Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі* БССР (ВСНГ БССР)] і Надзвычайная камісія (ЧК), якая ў 1922 пераўтворана ў *Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне БССР* (ДПУ) пры СНК БССР. У сувязі са стварэннем СССР змянялася структура органаў кіравання. Узмацнялася роля цэнтр. дзярж. і парт. органаў. Вырасла колькасць агульнасаюзных і аб'яднаных Н.к. Адпаведныя змены ўнесены ў Канстытуцыю БССР (1927). З пач. 1930-х г. павялічылася колькасць Н.к., пастаянна рэарганізоўвалася іх структура. Большасць наркомаў, іх намеснікаў, кіруючых работнікаў Н.к. БССР былі рэпрэсіраваны. У час Вял. Айч. вайны Н.к. БССР працавалі як структурныя падраздзяленні агульнасаюзных, колькасць якіх павялічылася. З пач. вызвалення Беларусі Н.к. БССР аднавілі сваю дзейнасць на тэр. рэспублікі. З 1920 да 1946 у БССР у розны час дзейнічала 38 Н.к. (гл. табл.). Да сак. 1946 кіраўніцтва ў Беларусі ажыццяўлялі 25 агульнасаюзных, 13 саюзна-рэсп. і 6 рэсп. Н.к., створана сістэма поўнага падпарадкавання агульнасаюзным Н.к. такіх галін, як машына-, аўтамабіле-, трактарабудаванне, хімічная, нафтавая прамысловасць. Паводле Указа Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 26.3.1946 Н.к. ў БССР рэарганізаваны ў мін-вы БССР.

*Літ.*: История государства и права Белорусской ССР. Т. 1—2. Мн., 1970—76; История Советской Конституции (в документах), 1917—1956. М., 1957; Сборник законов БССР и Указов Президиума Верховного Совета БССР, 1938—1955 гг. Мн., 1956; Органы государственного управления Белорусской ССР (1919—1967 гг.). Мн., 1968. *В.Ф.Кушнер.*

**Народныя камісарыяты БССР**

| Назва наркамата | Калі існаваў |
|---|---|
| Замежных спраў | снеж. 1920 — да канца 1922, з сак. 1944 |
| Ваен. спраў | снеж. 1920 — да канца 1922 |
| Па справах нацыянальнасцей | снеж. 1920 — да канца 1922 |
| Унутр. спраў | снеж. 1920 — снеж. 1930, з ліп. 1934 |
| Юстыцыі | са снеж. 1920 |
| Працы | снеж. 1920 — вер. 1933 |
| Сац. забеспячэння | са снеж. 1920 |
| Асветы | са снеж. 1920 |
| Фінансаў | са снеж. 1920 |
| Земляробства | са снеж. 1920 |
| Пошт і тэлеграфаў | снеж. 1920—1922 |
| Аховы здароўя | са снеж. 1920 |
| Рабоча-сялянскай інспекцыі | снеж. 1920 — сак. 1934 |
| Харчавання | снеж. 1920 — крас. 1924 |
| Вышэйшы савет нар. гасп. (да 1924 СНГ) | снеж. 1920 — крас. 1932 |
| Надзвычайная камісія (ЧК) | снеж. 1920 — сак. 1922 |
| Дзярж. паліт. ўпраўленне (ДПУ) | сак. 1922 — ліп. 1934 |
| Дзяржаўная планавая камісія | з крас. 1923 |
| Унутр. гандлю | ліп. 1924 — май 1926 |
| Знешняга і ўнутранага гандлю | май 1926 — люты 1931 |
| Гандлю | з крас. 1938 |
| Забеспячэння | люты 1931 — вер. 1934 |
| Камунальнай гасп. | з ліп. 1931 |
| Лёгкай прамысловасці | крас. 1932 — вер. 1934, са снеж. 1936 |
| Лясной прамысловасці | са снеж. 1936 |
| Збожжавых і жывёлагадоўчых саўгасаў | са снеж. 1936 |
| Харч. прамысловасці | са снеж. 1936 |
| Мясной і малочнай прамысловасці | з ліп. 1939 |
| Тэкст. прамысловасці | з вер. 1939 |
| Мясц. паліўнай прамысловасці | са жн. 1939 |
| Мясц. прамысловасці | з вер. 1934 |
| Прамысловасці буд. матэрыялаў | з ліп. 1939 |
| Дзярж. кантролю | з ліст. 1940 |
| Меліярацыі | з сак. 1941 |
| Аўтамаб. транспарту | з ліп. 1939 |
| Дзярж. бяспекі | сак.—жн. 1941, са снеж. 1943 |
| Жыллёва-грамадзянскага буд-ва | з кастр. 1944 |
| Тэхн. культур | са студз. 1946 |

**НАРО́ДНЫЯ КАНСЕРВАТО́РЫІ**, першыя прафесійныя муз. навуч. ўстановы ў Расіі і на Беларусі. Існавалі ў пач. 20 ст. Першыя Н.к. адкрыліся ў Маскве (1906) і Пецярбургу (1908). Найб. пашырыліся пасля 1917. Давалі пач. і сярэднюю спец. муз. адукацыю. На Беларусі адкрыты ў Віцебску (1918, першы прыём 209 чал.), Гомелі, Мінску (абедзве 1919), Бабруйску (1921, першы прыём 211 чал.). Мелі выканальніцкія (фп., скрыпка, віяланчэль, духавыя інструменты, сольныя і хар. спевы) і кампазітарскі класы, у Гомелі і клас гісторыі музыкі і эстэтыкі. Навучаліся грамадзяне розных узросту і падрыхтоўкі. У праграме заняткаў былі толькі муз. дысцыпліны, якія выкладаліся на дастатковым прафес. узроўні. Існавалі кансерваторыі з праграмамі, агульнымі для ўсіх навучэнцаў і дыферэнцыраванымі паводле ўзроставага прынцыпу, і Н.к. з 2 курсамі навучання — прафес. і асветным (у Гомелі), што садзейнічала муз. і культ.-асв. адукацыі шырокіх нар. мас. У стварэнні і рабоце Н.к. удзельнічалі вядомыя рас. музыканты, у т.л. піяністы Э.Бай, М.Дубасаў, Е.Шуман, скрыпачы А.*Бяссмертны*, К.Грыгаровіч, кампазітар М.*Анцаў*, дырыжор М.*Малько*, выкладчыкі класаў духавых інструментаў О.Шуман, С.Браўдо (усе Віцебск), М.Назараў (Гомель). Выкладчыкі і навучэнцы Н.к. вялі вял. культ.-асв. работу, наладжвалі канцэрты, у т.л. сімфанічныя, гутаркі, лекцыі, масавыя святы і інш. У 1-й пал. 1920-х г. Н.к. пераўтвораны ў муз. тэхнікумы (Віцебскі, Гомельскі), школы (Бабруйская).

*Літ.*: Масленікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі. Мн., 1980. С. 40—55; Пракапцова В.П. Мастацкая адукацыя ў Беларусі. Мн., 1999. *В.П.Пракапцова.*

**НАРО́ДНЫЯ МАСТА́ЦКІЯ ПРО́МЫСЛЫ**, адна з форм *народнай творчасці*, звязаная з вырабам прадметаў дэкар.-прыкладнога характару на продаж; галіна *народнага дэкаратыўна-приклад-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ